УДК 821.161.3.09.

# МАТЫЎ «ПРАСТОРАЎ ЖЫЦЦЯ» ЯК РЭПЛІКА Ў ДЫЯЛОГУ З КЛАСІКАМ

**А.І. Белая, П.В. Куцень**
*Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, Рэспубліка Беларусь,*
*alba.57@mail.ru, polinakutsen2004@mail.ru*

У артыкуле разглядаецца верш М. Канановіча «На прасторах жыцця» як узор філасофскай лірыкі, у якім паэт апелюе да коласаўскага вобраза-матыву, што выкарыстаны абодвума аўтарамі ў якасці назвы твораў. Аперацыяналізуюцца асноўныя паняцці, датычныя адлюстравання міжтэкставых сувязяў, даследуецца пашырэнне інтэртэкстуальнага поля матыву «прастораў жыцця» ў параўнанні з тэкстам-папярэднікам; робяцца высновы пра адметнасць творчага дыялогу сучасніка і класіка.

*Ключавыя словы:* інтэртэкстуальнасць; філасофская лірыка; Я. Колас; «юнацкая аповесць»; М. Канановіч; прэцэдэнтны вобраз.

Паводле энцыклапедыі «Постмадэрнізм», інтэртэкстуальнасць – паняцце, якое «артыкулюе феномен узаемадзеяння тэксту з семіятычным культурным асяроддзем у якасці інтэрыярызацыі вонкавага» [2, с. 333]. Як вядома, тэрмін быў уведзены у 1967 годзе тэарэтыкам постструктуралізма Ю. Крысцевай на аснове аналізу канцэпцыі «поліфанічнага рамана» М. Бахціна, які вызначаў, што, акрамя дадзенай мастаку рэальнасці, існуе і іншая, выяўленая ў творах ранейшай і сучаснай літаратуры, і яны знаходзяцца ў непарыўным дыялогу паміж сабой. Паводле сцвярджэння Ралана Барта, кожны тэкст уяўляе сабой новую тканіну, вытканую са старых цытат. Абрыўкі старых культурных кодаў, формул, рытмічных структур, фрагменты старых ідыём і г. д. – усе яны паглынутыя тэкстам і перамяшаныя ў ім, паколькі заўсёды перад тэкстам і вакол яго існуе мова. Постмадэрнісцкае прачытанне тэксту «выткана з цытат, спасылак, водгукаў; усё гэта мовы культуры... старыя і новыя, якія праходзяць праз тэкст і ствараюць магутную стэрэафанію», гульня цытат фактычна з'яўляецца гульнёй «моў» культуры, у якой «ні адна мова не мае переваґі перад іншай». З пункту гледжання постмадэрнізму, тэкст існуе толькі ў сілу міжтэкставых адносін, у сілу інтэртэкстуальнасці, і ў гэтых адносінах інтэртэкстуальнасць выступае як «неабходная папярэдняя ўмова для любога тэксту» (Р.Барт) [2, с. 333-335]. У постмадэрнісцкай парадыгме пад цытатай разумеецца не толькі ўкрапленне тэкстаў адзін у аднаго, але і плыні кодаў, жанравыя сувязі, тонкія парафразы, асацыятыўныя дасылкі, ледзь улоўныя алюзіі і інш.

Ж. Жэнетам была распрацавана класіфікацыя тыпаў узаемадзеяння тэкстаў. Згодна з ёй, існуе пяць тыпаў сувязі паміж тэкстамі:

1. Уласна інтэртэкстуальнасць як сапрысутнасць ў адным тэксце двух і больш розных тэкстаў (цытата, плагіят, алюзія і інш.).
2. Паратэкстуальнасць як адносіны тэксту да сваёй часткі (эпіграфа, загалоўка, устаўной навелы).
3. Метатэкстуальнасць як суадносіны тэксту са сваімі падтэкстамі.
4. Гіпертэкстуальнасць як жанравыя сувязі тэкстаў.

Сучасная паэзія характарызуецца ўцягваннем у аўтарскі тэкст шматлікіх інтэртэкстуальных элементаў [3].

Паэтычны тэкст, у адрозненне ад празаічнага, разлічаны на больш гнуткае і шматзначнае прачытанне, і для адэкватнага ўспрымання аўтарскай задумы вельмі важна наяўнасць інтэлектуальна падрыхтаванага чытача. Паводле Ю. Лотмана, у паэзіі заўсёды ажыццяўляецца палілог розных карцін свету, і таму паэтычны тэкст з'яўляецца поліфанічным. Ён выбудоўваецца на літаратурных асацыяцыях.Форма паэтычнага тэксту не дазваляе ўжывання непасрэдных цытат, але тым не менш паэт адсылае чытача да канкрэтных рэалій культурна-бытавога і літаратурнага асяроддзя. А. Весялоўскі ў «Гістарычнай паэтыцы» пісаў, што паэт звязаны матэрыялам, створаным папярэднікам, яго пункт адліку зададзены менавіта яго творамі.

Паняцце інтэртэкстуальнасці ў паэзіі вельмі часта фігуруе на ўзроўні матыву. Чытач павінен атрымліваць эстэтычнае задавальненне ад разумення таго, як тэкст быў створаны, ад пазнавання знаёмых матываў, ад выбудоўвання інтэртэкстуальных сувязяў. Матывы ўяўляюць сабой сэнсы і звязваюць тэксты за межамі аднаго твора ў адзіную сэнсавую прастору. У такім сэнсе можна разглядаць міфалагічныя, фальклорныя, біблейскія матывы, якія пераўтвараюцца ў сетку ўзаемных адлюстраванняў у паэтычных тэкстах.

Паколькі ў розныя часавыя адрэзкі названыя матывы маюць адметныя афарбоўкі, трэба гаварыць аб напластаванні сэнсаў, прыстасаваных да мастацкіх запытаў сучаснасці, што правакуе пашырэнне інтэртэкстуальнага поля паэтычнага матыву [3]. Гэта, на нашу думку, мае адносіны і да ўзроставых перыядаў жыцця таго ці іншага творцы.

Мы звярнуліся да матыву «прастораў жыцця» ў вершы паэта са Слонімшчыны, нашага сучасніка Міколы Канановіча. Верш «На прасторах жыцця» (2024) [5] адносіцца да філасофскай лірыкі, якая адлюстроўвае феномены, з'явы, ідэі, актуальныя на ўсім працягу існавання чалавецтва. Падставай для характарыстыкі верша як твора філасофскай лірыкі робіцца не толькі форма (рэфлексіі, роздуму, развагі), а і адпаведны змест [4].

Як добра вядома ў беларускай культурнай прасторы, назву «На прасторах жыцця» мае «юнацкая аповесць» Якуба Коласа, які і з'яўляецца заснавальнікам названага жанру. Гэта першы буйны твор пісьменніка на матэрыяле савецкай рэчаіснасці. А ў гісторыі станаўлення і развіцця жанру аповесці для юнацтва «аўтарская ідэя заўсёды была накіравана на фарміраванне маральна-духоўнай і патрыятычнай асобы»[6]. З назвы аповесці вынікае ідэя адлюстравання перспектыў для маладога пакалення праз яго імкненне да асветы і стваральнай працы на карысць грамадства.У аповесцях для юнацтва аўтарскія каштоўнасныя ўстаноўкі закліканы спрыяць асэнсаванню чытачом свайго ўнутранага свету, разнастайных нюансаў чалавечых узаемаадносін. Істотна тое, што гэты каштоўнасны змест фарміруюць пэўныя гістарычныя і грамадскія падзеі. Якуб Колас распавёў гісторыю жыцця хлопца і дзяўчыны, якія сталеюць і шукаюць сваё месца ў жыцці. У пачатку твора Сцяпан Барута і Алена Гарнашка яшчэ дзеці, а ў яго фінале –ужо дарослыя, упэўненыя ў сабе асобы з цвёрдым бачаннем сваёй мэты.

Аповесць Якуба Коласа адкрываецца праграмным дыялогам: *« – Вы павінны прабіць сабе дарогу і выйсці на шырокія прасторы жыцця. – А дзе такія шырокія прасторы?– У шырокіх размахах грамадскай работы»* [7, с. 6]. Гэты эпіграф адлюстроўвае асноўную думку твора: прасторы жыцця – гэта поле для сацыяльнай актыўнасці, калектыўнай працы і служэння агульнай мэце.

На першы погляд, «юнацкая аповесць» класіка і напісаны праз сто год пасля яе філасофскі верш сталага паэта маюць няшмат параметраў для тыпалагічнага параўнання. У вершы Міколы Канановіча метафара «прастораў жыцця» набывае супрацьлеглы сэнс – гэта месца, дзе сэнсы «губляюцца», «растрачваюцца».

Аднак паспрабуем абгрунтаваць наш выбар матэрыялу даследавання. Уласна філасофская лірыка накіравана на пазнанне асноў быцця і свядомасці, спасціжэнне ісціны, агульных ідэй і абстрактных катэгорый. Прадметам яе ўвагі з'яўляюцца бінарныя апазіцыі: жыццё – смерць, рух – статыка, імгненне – вечнасць, дух – плоць, глыбіня – паверхня, цэласнасць – разасобленасць, прыгожае – пачварнае і інш.

Верш Міколы Канановіча – мастацкае адлюстраванне ўнутранай рэфлексіі лірычнага героя пра сэнс чалавечага існавання. У творы можна вылучыць некалькі бінарных апазіцый катэгорый экзістэнцыяльнага крызісу.

Знаходзячыся ў сталым узросце, аўтар натуральным чынам супрацьпастаўляе маладосць і старасць: юнацкая энергія, прывабнасць і ўпэўненасць у сабе з цягам часу змяняюцца адчуваннем страты, адчужэння, непатрэбнасці (*«І юнацкія джынсы не ўспрэш на сябе, / І прыгожае цела належыць ні ёй, ні табе» [5]).* Паўната папярэдняга жыцця супрацьпастаўляецца ўнутранай пустэчы. Жыццё здаецца

марна пражытым і пакідае пасля сябе глыбокую ўнутраную недаказанасць (*«На прасторах жыцця мы дарэшты растрачваем час, / І ў страчаным часе ранейшых не знойдзеш там нас» [5]*). Глабальная бінарная апазіцыя – жыццё і смерць. У фінале чалавечага існавання гэтыя супрацьлеглыя паняцці губляюць сваю выразнасць. Сэнс жыцця знікае пакрысе страчваецца *(«І жывеш на зямлі ты проста таму, што жывеш / І ведаць не хочаш, калі гэты скончыцца трэш» [5])*, а смерць успрымаецца як непазбежны, факт, незалежны ад нашых адносін да яе.. Слэнгавае словам *трэш* маніфестуе моцныя негатыўныя эмоцыі, дае даволі дакладнае азначэнне жыццёвага тупіка і бессэнсоўнасці існавання. А гэта дазваляе ўзбуйніць апазіцыю жыццё-смерць да маштабу быццё-нябыт.

Адметным чынам у вершы «сваё» проціпастаўляецца «чужому» *(«На прасторах жыцця ўрэшце ты застаешся адзін / Сярод розных чужых, непатрэбных, як той бедуін» [4])*. Лірычны герой Міколы Канановіча не мае ўплыву на сітуацыю, не мае магчымасці выявіць тыя фактары, якія размяжоўваюць сваё і чужое. Можа здацца, што этнонім *бедуін* скарыстаны паэтам толькі дзеля небанальнай рыфмы. Але параўнанне лірычнага героя з бедуінам, на нашу думку, вельмі дарэчнае. Як вядома, бедуіны – арабы-качэўнікі, жыхары пустыні, якая і складала іх рэальныя «прасторы жыцця». Плямёны бедуінаў няспынна перамяшчаліся з месца на месца, пераадольваючы тысячы кіламетраў па пясчаных дзюнах. Яны сімвалізуюць абсалютную асабістую свабоду, непарыўную сувязь з прыродай, а таксама ўспрымаюцца як захавальнікі старадаўніх звычаяў, культуры і каштоўнасцей. «У шырокім сэнсе бедуін – гэта ўвасабленне рамантыкі вандроўнага жыцця і вечнага пошуку новых даляглядаў» [8]. А гэта неад’емныя характарыстыкі кожнай творчай асобы.

У радках *«Адыходзяць сябры, землякі, гаспадаркі і хаты ў зямлю. / Не паспееў і не скажаш ніколі ім больш ты: “Люблю!”»* [5]асабовая цэласнасць лірычнага героя, укаранёнасць у навакольны свет супрацьпастаўляюцца адзіноце. Блізкія людзі, сябры, родныя мясціны паступова сыходзяць з жыццёвых даляглядаў, пакідаючы яго героя сам-насам з бясконцасцю, дзе робіцца няўтульна і сцюдзёна, *«бо сэнс існавання згубіў на прасторах жыцця…»* [5]. Галоўная думка верша заключаецца ў сцвярджэнні непазбежнасці страты жыццёвага сэнсу ў бясконцым свеце. У эмацыянальнай палітры пераважае сум ад канстатацыі экзістэнцыйнай пустэчы, якая робіць жыццёвы рух механічным. Аднак фінал твора нельга назваць песімістычным. І справа не толькі ў тым, што ён кажа пра сябе: *«Паэзію любіш, рыбалку, жанчын і віно – / Не так ужо й мала што ёсць і калісьці было»*. Найвялікшы сэнс жыцця заключаецца ў самім жыцці: *«І іншага сэнсу, як жыць, у цябе і няма»* [5].

Такім чынам, праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць наступныя высновы. Мікола Kананoвіч у вершы «На прасторах жыцця» ажыццяўляе своеасаблівы дыялог, палеміка з класікам па прынцыпе «сувязь-адштурхоўванне». Гэта такі спосаб пераемнасці, пры якім крытычна пераасэнсоўваюцца, адмаўляюцца ці пaрадыруюцца традыцыі, стыль, ідэі аўтарытэтных папярэднікаў. Нягледзячы на тоеснасць назваў, творы належаць да розных эпох, літаратурных кірункаў, светапоглядаў і, найперш, жанраў. Іх параўнанне раскрывае дыяметральна супрацьлеглыя погляды на сэнс чалавечага існавання – ад юнацкай веры ў будучыню да горкага экзістэнцыйнага расчаравання. У Якуба Коласа прасторы сімвалізуюць багацце магчымасцей і жыццёвай паўнаты. У вершы гэты вобраз афарбоўваецца

аўтарскай іроніяй, бо юнацкі максімалізм змяніўся на горкі досвед сталасці. Але ў цэлым пафас верша нельга назваць песімістычным.

У адносінах да верша М. Канановіча аднайменная аповесць Якуба Коласа выступае як прэцэдэнтны тэкст, тэкст-папярэднік. Назва верша з'яўляецца нацыянальна-прэцэдэнтным феноменам – выказваннем, якое ў беларускай культурнай прасторы выкарыстоўваецца як гатовая формула і не патрабуе дадатковых тлумачэнняў. І назва, і галоўная метафара верша ўтвараюць непасрэдную інтэртэкстуальную сувязь з аднайменнай аповесцю Якуба Коласа.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Макарава, С. У. Да праблемы інтэртэкстуальнасці / С. У. Макарава // Thesaurus : зб. навук. пр. / Магілёўскі інстытут МУС. – Магілёў, 2015. – Вып. 1. – С. 136–139.

2. Постмодернизм: Энцикл. / [Сост. и науч. ред.: А. А. Грицанов, М. А. Можейко]. – Минск : Интерпрессервис, Кн. Дом, 2001. – 1037 с.

3. Пухонская, О. Я. Интертекстуальный аспект современной поэзии / О. Я. Пухонская // Актуальные проблемы гуманитарных и естественных наук. – 2012. – №12. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/intertekstualnyy-aspekt-sovremennoy-poezii (дата обращения: 15.03.2026).

4. Сучасная беларуская філасофская паэзія / [Электронный ресурс] // elib.gsu.by : [сайт]. – URL: https://elib.gsu.by/bitstream/123456789/41779/1/1.2 (дата обращения: 08.04.2026).

5. Канановіч, М. На прасторах жыцця / М. Канановіч [Электронный ресурс] // m.vk.com: [сайт] – URL: https://m.vk.com/id72894853?offset=10&own=0 (дата обращения: 15.03.2026).

6. Смаль, В. М. Аўтарскія каштоўнасныя ўстаноўкі ў беларускай юнацкай аповесці апошніх дзесяцццігоддзяў / В. М. Смаль [Электронный ресурс] // elib.bsu.by : [сайт]. – URL: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/323654/1/255-258.pdf (дата обращения: 10.12.2025).

7. Колас, Я. Збор твораў. У 20 т. Т. 12. Аповесці / Я. Колас – НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск: Беларус. навука, 2010. – 518 с.

8. По следам бедуинов / [Электронный ресурс] // visitdubai.com : [сайт]. – URL: https://www.visitdubai.com/ru/articles/life-of-a-bedouin-al-marmoom (дата обращения: 12.04.2026).

## THE MOTIVE OF «THE VASTNESS OF LIFE» AS A REMARK IN A DIALOGUE WITH A CLASSIC

**A.I. Belaya, P.V. Kuten**
*Baranovichi State University, Republic of Belarus*
*alba.57@mail.ru, polinakutsen2004@mail.ru*

The article examines M. Kononovich's poem «In the vastness of life» as an example of philosophical lyrics, in which the poet appeals to the Kolas's image, a motive used by both authors as the title of the works. The basic concepts concerning the reflection of intertextual connections are operationalized, the expansion of the intertextual field of the motive of «the expanses of life» is investigated in comparison with the predecessor text; conclusions are drawn about the peculiarities of the creative dialogue between the Contemporary and the classic.

*Keywords:* intertextuality; philosophical lyrics; Y. Kolos; «youth story»; M. Kononovich; precedent image.